# НАЗЫВАЯ СЕБЯ УЧИТЕЛЕМ, МЫ ДОЛЖНЫ ПОНИМАТЬ, ЧТО ИСТИННЫЙ УЧИТЕЛЬ – ГОСПОДЬ

***Н.Н. Павловец***
*Пинский государственный колледж строителей*

"Шлях да адраджэння страчанага…" ( пра славутую дынастыю Рубановічаў)

Старажытнае лацінскае выслоўе гаворыць: "Historia est magistra vitae", што ў перакладзе азначае: "Гісторыя ёсць настаўніца жыцця". Сапраўды, гісторыя – гэта не толькі вывучэнне мінулага, а гэта спадчына, падмурак і вопыт, абапіраючыся на якія мы будуем жыццё.

35 гадоў для гісторыі – гэта імгненне… Менавіта столькі часу прайшло, калі я скончыла Махроўскую СШ, што ў Іванаўскім раёне. У час майго наведвання школы я трапіла ў гісторыка-краязнаўчы музей. Асабліва ўразіў мяне партрэт Анатоля Паўлавіча Рубановіча. Я была аднакласніцай яго ўнучкі Алены, а вось пазней самой ужо давялося выкладаць сусветную мастацкую культуру ў праўнука Андрэя.

Чаму такая пашана гэтаму чалавеку ў вёсцы вырашыла даведацца зусім нядаўна. Вось дык не думала, што застыне ў памяці тая мімалётная гутарка, якая адбылася ў кастрычніку з маёй былой аднакласніцай. Менавіта ў Дзень маці абарвалася жыццё дачкі Анатоля Паўлавіча, Вольгі . Прайшоў яшчэ адзін год…

Мой родны кут, мая малая радзіма! З любоўю і пяшчотай я гавару табе словы ўдзячнасці за незабыўны воблік, які заўсёды будзе жыць у памяці. Родныя мясціны, мілы сэрцу куточак зямлі, дзе пралягалі сцежкі майго юнацтва, дарагая вёска Махро… Чым больш становіцца гадоў, тым часцей усплывае роднае, гаваркое слова, яго меладычнае гучанне з вуснаў маіх аднавяскоўцаў. Люблю прыязджаць у вёску, дзе і сёння жывуць людзі, якія, па словах Ф.Янкоўскага, "мая жывіца, мая энергія".

Калі ў канцы 70-х гадоў у вёсцы адбылася нумарацыя вуліц і дамоў, сельскі савет прыняў рашэнне назваць некаторыя вуліцы імёнамі партызан, якія прымалі ўдзел у вызваленні Махроўскага сельсавета: Герасімава, Кунькова, Самуйліка…Былі тут яшчэ і наз-

вы вуліц для ўсіх больш звыклыя: Школьная, Леніна, Першамайская, Вішнёвая, Перамогі… І толькі зусім нядаўна Юбілейная стала вуліцай А.Рубановіча, з нагоды стогадовага юбілею Анатоля Паўлавіча Рубановіча.

Што гэта за чалавек? Чаму ў гонар яго назвалі вуліцу? Правучыўшыся з унучкай у школе столькі год, ніколі пра А.П.Рубановіча не было размовы. Пабываўшы ў гасцях у Алены ў Іванава, заўважыла, што карціны Анатоля Паўлавіча вісяць у пакоі на самым бачным месцы. Ганарылася імі ўнучка, таму адбылася і размова пра знакамітага дзядулю.

Каб сабраць больш поўны матэрыял, я звярнулася за дапамогай да мясцовых жыхароў і ў школьны музей. А тут і фотаздымкі, і артыкулы з газет, і пажаўцелыя лісты… Але асаблівую ўвагу прыцягнулі карціны, напісаныя Рубановічам у розны час, а яшчэ… яго вершы.

Анатоль Паўлавіч Рубановіч нарадзіўся 12 красавіка 1908 года ў Мінску ў сям'і святара. Бацьку накіравалі служыць у Махроўскую Петра-Паўлаўскую царкву, а з ім пераехала і яго сям'я. Ужо ў трынаццацігадовым узросце ў юнака былі заўважаны здольнасці да малявання. Каб і далей развіваць талент, Анатоля адпраўляюць вучыцца ў Варшаву ў мастацкае вучылішча. На гэтым яго вучоба не скончылася: Анатоль Паўлавіч прадоўжыў вучобу ў акадэміях мастацтваў Вены і Парыжа. Яшчэ да вайны яго працы ўдзельнічалі ў выставах, якія праходзілі ў мастацкім салоне ў Вільні.

Пачалася вайна. Акупацыя. І месяца не прайшло, як Рубановіча – самага адукаванага ў вёсцы чалавека – нямецкія ўлады прызначаюць у сельскай управе войтам. Са слоў сведкаў, неаднаразова пацвярджалася, што А.П. Рубановіч меў сувязь з партызанамі і двойчы ратаваў ад смерці многіх жыхароў вёскі, прадухіляў масавыя расстрэлы, згладжваў канфлікты, якія зрэдку здараліся паміж мясцовымі жыхарамі. А вось сябе зберагчы не змог ад ГУЛАГу. Былыя партызаны, якія ведалі не па чутках пра службу Рубановіча, пісалі ва ўсе інстанцыі. Не дапамагло.

У 1947 годзе, калі дачцэ Волечцы было ўсяго дзевяць месяцаў, Анатоля Паўлавіча арыштавалі і асудзілі на 10 гадоў. Тры гады з іх ён правёў у Мінскім астрозе, затым быў адпраўлены ў Архангельскую вобласць. У пасёлку Ласінае, дзе знаходзіўся чатыры гады, прадоўжыў займацца сваёй любімай справай: пісаў партрэты і пейзажы. Датэрмінова вызвалены.

Толькі праз сем гадоў вярнуўся Анатоль Паўлавіч да сваіх родных. Увесь сівы, з падарваным здароўем, з хворымі нагамі, але з неадольным жаданнем зноў тварыць. З 1960 года Рубановіч працуе настаўнікам выяўленчага мастацтва, загадчыкам сельскім клубам і кіруе калектывам мастацкай самадзейнасці ў Махро.

Анатоль Паўлавіч быў цудоўным партрэтыстам, іканапісцам, пейзажыстам. Яго пейзажы гучаць, адчуваецца нейкі водар прыроды. Яны адрозніваюцца прадуманай кампазіцыяй, выразнай і праўдзівай перадачай рэчаіснасці. А.П. Рубановіч любіў вясну і восень, любіў неба, любіў роднае наваколле з яго тонкім хараством.

Анатоль Паўлавіч Рубановіч са славутай дынастыі святароў, якая бярэ свой пачатак з 1777 года. Родапачынальнікам дынастыі з'яўляецца Рыгор Рубановіч, які служыў у Кіеве. Пра Якава Рубановіча звестак вельмі мала. Апошнім месцам служэння Якава Рубановіча была вёска Ляхавічы Іванаўскага раёна. Чацвёра яго сыноў Рыгор, Адам, Андрэй, Вісарыён былі псаломшчыкамі. Андрэй Якаўлевіч нарадзіўся ў в. Лемяшэвічы, 37 гадоў праслужыў у Вітчэўскай царкве. Адам пачаў служыць у Парэчскай царкве, а потым у в.Лемяшэвічы. Там і нарадзіліся дзеці: Павел, Яўген, Парфірый. Але апошнім месцам працы Адама Якаўлевіча была праваслаўная царква Прысвятой Багародзіцы ў вёсцы Востраў, што знаходзіцца на мяжы з Украінай. Тут ён і знайшоў свой апошні прытулак. Памёр Адам Рубановіч у 1910 годзе, яму было 64 гады, і пахаваны на тэрыторыі мясцовай царквы.

Павел Адамавіч нарадзіўся 13 кастрычніка 1876 года, выхоўваўся ў Пінскім духоўным вучылішчы. Далей дакументы сведчаць: " 23 января 1905 года бракосочетались Павел Адамович Рубанович первым браком 28 лет с Ольгой Владимировной Вруцевич 20 лет". У гады Першай сусветнай вайны служыў палкавым святаром, меў узнагароды.

Пазней звяртаецца з прашэннем перавесці яго на царкоўную службу і з 1925года ён служыць у Лагішыне. Павел Адамавіч піша ў Духоўную кансісторыю: “Прошу перевести меня в лучший приход, каковым, по моему мнению, является Мохро Пинского уезда. 11 февраля 1927г.” І так гэты адукаваны чалавек апынуўся ў Махроўскай Петра-Паўлаўскай царкве, каб несці людзям веру ў Бога. З успамінаў Гацэвіча У.: “Строгі быў чалавек, любіў ва ўсім парадак і дысцыпліну. Да яго жонкі Вольгі Уладзіміраўны ішлі за медыцынскай дапамогай, і яна нікому не адмаўляла”. Успамінае Клімовіч В.Н.: “Бацька мой служыў старастай у царкве, успамінаў, як бацюшку выклікалі ў Янава ў міліцыю. Ён вярнуўся позна, прыйшоў нейкі змучаны і разгублены, а ноччу памёр”. Пасля яго смерці стаў святаром Калінін Серафім Якаўлевіч, а псаломшчыкам служыў сын Паўла Адамавіча – Анатоль, які напісаў для царквы іконы Мікалая Цудатворцы і Серафіма Сароўскага, зрабіў Распяцце.

Парфірый Рубановіч – родны дзядзька Анатоля Паўлавіча. Нарадзіўся ў 1883 годзе ў вёсцы Лемяшэвічы, вучыўся ў Мінскай духоўнай семінарыі. Пасля прыняцця сана, іерэй Парфірый служыў у Свята-Троіцкай царкве в. Дабраслаўка Пінскага уезда. З 1914 года ён пачаў сваё хрысціянскае служэнне ў Заслаўі. Двойчы быў арыштаваны, але не адрокся ад сана. У чэрвені 1936 годзе яму загадалі выехаць з Заслаўя, а ў 1943г. пратаіерэя расстралялі партызаны. У 2000 г. рашэннем Сінода Беларускай Праваслаўнай Царквы у ліку 23 новапакутнікаў Мінскай епархіі, пацярпелых за веру Хрыстову, яго кананізавалі як святога пакутніка (памяць 28 кастрычніка). Святога Парфірыя Рубановіча шануюць як заступніка Заслаўя, святым лічаць яго і на Піншчыне.

У жыцці бывае так, што чалавек міжволі аказваецца ў віры лёсавырашальных падзей. Тады ён ці становіцца іх ахвярай, ці маючы цвёрдую волю і мужнасць, удзельнічае ў гэтых падзеях, уплывае на іх і ўваходзіць у гісторыю як вялікая асоба.

У біяграфіі А.П. Рубановіча, напэўна, яшчэ ёсць невядомыя звесткі, але спадзяюся, што мая праца яшчэ раз сведчыць пра тое, што мы памятаем гэтага чалавека, цікавімся яго творчасцю, аддаем даніну павагі як знатнай асобе.

О жизни и смерти

Жизнь – это время погод и ненастья,
Жизнь – это время борьбы роковой,
Жизнь – это горе с росинками счастья,
Жизнь – это море с бурлящей волной.

Смерть – это время отчаяний мнимых,
Смерть – это время земли гробовой,
Смерть – это горе родных и любимых,
Смерть – это тихий и вечный покой.

Пос. Лосиное, 9-10 января 1954г.